Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-02-05

# Люты

**10 – Кучар Фелікс Айзікавіч** (1935, Мінск – 2009), аператар, рэжысёр, сцэнарыст дакументальнага кіно – 80 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Аладава Радаслава Мікалаеўна** (1945, Мінск), музыказнаўца – 70 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Кусянкоў Мікола** (Мікалай Сяргеевіч; 1935, Добрушскі р-н – 2004), пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1991), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (2000) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Радзівіл Францішка Уршуля** (1705 – 1753), пісьменніца, паэтэса, першая жанчына-драматург у ВКЛ, заснавальніца Нясвіжскага тэатра Радзівілаў – 310 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Хілько Юрый Іванавіч** (1960, Баранавічы), графік, лаўрэат прэміі Міжнароднага фонду славянскага пісьменства імя св. Кірылы і Мяфодзія (1990), дыпламант рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў кніжнага мастацтва, творы якога знаходзяцца ў вядучых музеях Беларусі, у графічных і мастацкіх цэнтрах Германіі, Швецыі, ЗША, – 55 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Грамыка Любоў (Эма) Мікалаеўна** (1935, Расія), мастацтвазнаўца, жывапісец, дама ордэна святой роўнаапостальнай княгіні Вольгі РПЦ – 80 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Дзядзюшка Уладзімір Іосіфавіч** (1905, Мінск – 1973), акцёр, народны артыст Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952) – 110 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Цобкала Андрэй Анатольевіч** (1955, Навагрудак), вучоны-гісторык, аўтар працаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, амерыканскай гістарыяграфіі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Сахута Яўген Міхайлавіч** (1945, Стаўбцоўскі р-н), мастацтвазнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996), прэміі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1997), прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2008) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Навуменка Іван Якаўлевіч** (1925, Рэчыцкі р-н – 2006), народны пісьменнік Беларусі, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967), прэміі НАН Беларусі (1997), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1972) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі** (Мінск; 1925), культурная ўстанова – 90 гадоў з часу заснавання.

**17 – Вішнеўскі Уладзімір Мікалаевіч** (1955, Слуцкі р-н), мастак, які працуе ў жывапісе, скульптуры, станковай і кніжнай графіцы, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2009) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Картэс Сяргей Альбертавіч** (1935, Чылі), кампазітар, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Аўсяннікаў Генадзь Сцяпанавіч** (1935, Магілёў), акцёр, народны артыст Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988), лаўрэат прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» (2006), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2008), кавалер ордэна Ф. Скарыны (2006) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Казімір Сваяк** (сапр. **Стаповіч Канстанцін Мацвеевіч**; 1890, Астравецкі р-н – 1926), пісьменнік, рэлігійны і грамадскі дзеяч – 125 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Бондар Таіса Мікалаеўна** (1945, Рудзенск – 2005), пісьменніца, перакладчыца, грамадская дзеячка, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2004) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Шруб Павел Міхайлавіч** (1955, Жыткавіцкі р-н), паэт, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей** (г.п. Круглае; 1990), дзяржаўная ўстанова – 25 гадоў з часу заснавання.

**21 – Філафей** (свецк. **Нарко Уладзімір Еўдакімавіч**; 1905, Мядзельскі р-н – 1986), праваслаўны царкоўны дзеяч – 110 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Аляхновіч Мсціслаў Антонавіч** (1905, Гродна – 1982), польскі вучоны-лінгвіст, які даследаваў рускую і беларускую мовы, беларускі фальклор, руска-беларуска-польска-літоўскія фальклорныя і моўныя сувязі – 110 гадоў з дня нараджэння.